
За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 4 (75) Красавік 2013 г.

На Леаніда Аўтухова склалі пратакол за парушэньне Закону аб СМІ


Леанід Аўтухоў

«Мяне вінавацяць у тым, што была перавышаная колькасьць асобнікаў партыйнага бюлетэня "Магістрат", які мы раздавалі 22 сакавіка. Але тыя асобнікі ніхто пры нас не лічыў, і адкуль узялася выніковая лічба, мне невядома. Акрамя гэтага, на сёньняшні дзень усе асобнікі мусілі быць зьнішчаныя. Аднак — не, яны фігуруюць у маёй новай адміністрацыйнай справе», - гаворыць старшыня Віцебскай абласной арганізацыі партыі БНФ.

24 красавіка **Леаніда Аўтухова** выклікалі ў Кастрычніцкі райаддзел міліцыі Віцебску, дзе азнаёмілі з пратаколам пра парушэньне заканадаўства аб СМІ Загадалі даць тлумачэньні, кажа актывіст: *«Я так і напісаў: на бюлетэні "Магістрат" пазначаны наклад — 299 асобнікаў, гэта не пэрыядычнае выданьне, і яно не падлягае абавязковай рэгістрацыі. Як лічылі тыя асобнікі, што ў нас былі, я ня ведаю. Гэта пры нас не рабілі. Стос бюлетэняў забралі, а потым прыйшоў міліцыянт і сказаў таму, хто складаў паперы: "Пішы -1 080 асобнікаў».*

Падзеі, пра якія распавядае спадар Аўтухоў, здарыліся яшчэ 22 сакавіка, напярэдадні Дня Волі. У той дзень яго разам з аднапартыйцам **Кастусём Смолікавым** затрымалі ў гандлёвым цэнтры «Эвіком». На абодвух склалі пратаколы за парушэньне заканадаўства аб масавых акцыях: маўляў, у бюлетэні «Магістрат» было запрашэньне на мітынг 25 сакавіка, забаронены мясцовымі ўладамі.

Падчас суду Кастусь Смолікаў спрабаваў тлумачыць судзьдзі Іне Грабоўскай, што распаўсюд бюлетэня да масавых акцыяў дачыненьня ня мае. Але яна прысудзіла абодвум актывістам па 5 сутак арышту. Палову з гэтага тэрміну яны адбылі ў ІЧУ яшчэ да суду, бо іх затрымалі ў пятніцу, і трымалі пад вартай да панядзелка — дарэчы, парушыўшы заканадаўчую норму пра тое, што суд мусіць адбывацца не пазьней як праз 48 гадзін пасьля затрыманьня...

Паводле рашэньня суду, усе рэчавыя доказы мусілі быць зьнішчаныя. Але асобнікі «Магістрату» захавалі да сёньняшняга дня, гаворыць Леанід Аўтухоў: *«Судовая пастанова ўступіла ў сілу, але "Магістрат" цэлы! Як мне сказалі, пасьля суду пра гэта нібыта хадайнічала кіраўніцтва Кастрычніцкага РАУС. Я пра гэта таксама нічога ня ведаў, як ня ведаў пра "падлікі", што адбываліся без маёй прысутнасьці. Я лічу, што адміністрацыйны перасьлед — гэта ціск на апазіцыю. Каб баяліся сказаць хоць слова пра свае погляды, каб не маглі даносіць свае ідэі да іншых людзей, каб зрабіць недаступнай любую праўдзівую інфармацыю».*

Старшыню віцебскай арганізацыі партыі БНФ зноў чакае суд. Дату працэсу пакуль не прызначылі.

ВІЦЕБСКІЯ СЯБРЫ КХП–БНФ ЗЛАДЗІЛІ ПІКЕТ У ПАМЯЦЬ ЧАРНОБЫЛЯ

У пікеце, які прайшоў 26 красавіка ў цэнтры Віцебску, узялі ўдзел двое сяброў КХП-БНФ. **Віталь Каваленка** і **Ян Дзяржаўцаў** цягам прыкладна 30-ці хвілін стаялі ля помніку Машэраву з плакатамі *«Будаваць АЭС бяз згоды народу можа толькі вораг Беларусі»* і *«Дыктатар! Пабудуеш Астравец — пажнеш Чарнобыль!»* Мінакі спыняліся ля пікетоўцаў, задавалі ім пытаньні, рабілі фатаграфіі з дапамогай здымачоў мабільных тэлефонаў.

Раней Ян Дзяржаўцаў прасіў улады дазволіць падобную акцыю ў гэты дзень у іншым месцы — у парку «Мазурына», але атрымаў забарону на яе правядзеньне. Заяўка на акцыю ля помніку Машэраву не



падавалася. Нягледзячы на тое, што пікет ня быў санкцыянаваны ўладамі, абышлося без затрыманьняў. Супрацоўнікі ворганаў аховы правапарадку зьявіліся ўжо тады, калі ўдзельнікі імпрэзы згарнулі плякаты. Міліцыянты пацікавіліся зьместам плякатаў і папярэдзілі, што калі тыя будуць разгорнутыя, удзельнікі акцыі будуць затрыманыя.

«Мы выйшлі, каб зьвярнуць увагу грамадзян Беларусі, на тое, што мінула ўжо 27 год з моманту катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, наступствы ж гэтай катастрофы будуць адчувацца яшчэ тысячы гадоў. Нягледзячы на тое, што ад Чарнобыля пацярпелі мільёны людзей, што забруджаныя тэрыторыі, наш нелегітымны прэзыдэнт хоча пабудаваць яшчэ адзін Чарнобыль. На маю думку, робіць ён гэта не дзеля народу, а каб утрымаць сваю ўладу, каб потым пужаць увесь сьвет ядзернай дубінай. Народ Беларусі павінен гэта ведаць», — паведаміў Ян Дзяржаўцаў наконт мэты правядзеньня акцыі.

Пятра Іванова аштрафавалі на 4 мільёны рублёў

Судзьдзя Першамайскага райсуду Валянціна Кісьмярошкіна прызнала апазыцыянэра Пятра Іванова вінаватым у ілжэсьведчаньні на супрацоўніка міліцыі і ў непадпарадкаваньні міліцыянтам. Агульная сума двух штрафаў — 4 мільёны рублёў. У судзе згадалі інцыдэнт, які здарыўся ў Віцебску 16 лютага. Тады Пётар Іваноў стаў сьведкам затрыманьня актывістаў аргкамітэту па стварэньні партыі БХД Аляксея Кішчука і Станіслава Лаўрэнава, якія выйшлі ў цэнтар Віцебску з расьцяжкай «Свабоду палітвязьням».

Міліцэйская машына, заехаўшы на ходнік, ледзьве ня зьбіла яго з ног. Спадар Іваноў зьвярнуўся да абласнога міліцэйскага кіраўніцтва, каб даведацца прозьвішча кіроўцы машыны, нумар якой ён зафіксаваў. Бо меркаваў напісаць заяву ў суд. 12 красавіка Пятра Іванова выклікалі ў абласную ўправу ДАІ, каб узяць тлумачэньні. Але падчас гутаркі падпалкоўнік Аляксандар Сьцяпанаў заявіў Іванову, што факты не пацьвердзіліся. А таксама — што Іваноў абвінавачваецца ў ілжэсьведчаньні і што яго будуць за гэта судзіць.

Паводле актывіста, такі паварот падзеяў быў нечаканы і дзіўны: «Я прыйшоў да падпалкоўніка Сьцяпанава, а той 4 гадзіны мяне дапытваў. Прычым такім чынам, што стараўся мяне пераканаць наконт нейкай матэрыяльнай кампэнсацыі. Нібыта я хачу яе з супрацоўніка міліцыі спагнаць. Я кажу яму: „Можа, я толькі запатрабую выбачэньняў?“ А той кажа: „Не-не-не, толькі грашовую кампэнсацыю!“ Я сказаў, што максымум, чаго запатрабую, то гэта 100 тысяч праз суд».

Адразу пасьля гэтага **тут жа, у ДАІ, на Пятра Іванова быў складзены пратакол за ілжэсьведчаньне на міліцыянта. Дарэчы, прозьвішча кіроўцы міліцэйскай машыны яму так і не паведамілі. Хоць Іваноў прасіў назваць яго, каб мець магчымасьць зьвярнуцца ў суд. Але было сказана, што праверка ягонай вінаватасьці не паказала.**

За ілжэсьведчаньне на супрацоўніка міліцыі судзьдзя Валянціна Кісьмярошкіна аштрафавала Пятра Іванова на 20 базавых велічынь — 2 мільёны рублёў. Ня стала аргумэнтам на карысьць актывіста ні тое, што ён абскардзіў пастанову, вынесеную ў ДАІ, ні тое, што ён зьвярнуўся ў абласную пракуратуру, каб паведаміць, што яго пазбавілі права на зварот у суд супраць парушальніка правілаў дарожнага руху.

Другі штраф, 20 базавых велічынь, Валянціна Кісьмярошкіна наклала на Пятра Іванова за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі. У гэтым яго абвінавацілі міліцыянты, якія гвалтам цягнулі актывіста ў суд. Бо Пётар Іваноў быў гатовы ісьці туды сам, але падпалкоўнік Сьцяпанаў сказаў, што ён затрыманы. І тады яшчэ двое міліцыянтаў, адзін у форме, а другі ў цывільным, схапілі яго пад рукі і пачалі штурхаць у машыну. Праўда, да суду так і не давезьлі: з паўдарогі вярнуліся ў Першамайскі РАУС, каб скласьці пратакол пра непадпарадкаваньне.



Пётар Іваноў

«Я не даваў падставаў сумнявацца, ці прыйду ў суд, калі будзе позва. Мне проста брыдка, калі нехта, не валодаючы належнымі прававымі ведамі, спрабуе давесьці, што гэта ён — улада! Ды яны ўладу толькі дыскрэдытуюць! Я толькі прасіў, каб мне далі дакумэнт, што я затрыманы. І калі будуць рабіць ператрус ці агляд — каб таксама далі паперу! А мне маёр Багатыроў, які штурхаў у машыну ды заводзіў у пастарунак, кажа: „У цябе яшчэ трэцяга правапарушэньня няма? Дык зараз напішу, што ты лаяўся матам, суд зачыніцца, пакуль будзем разьбірацца, а ты паедзеш на выходныя ў ізалятар часовага ўтрыманьня!“»

Пётар Іваноў у судзе не прызнаў сябе вінаватым і зьбіраецца абскарджваць пастанову. Да таго ж ён чакае адказу з пракуратуры і з абласной міліцэйскай управы на свае скаргі. Напісаць скаргі на супрацоўнікаў Першамайскага РАУС за перавышэньне службовых паўнамоцтваў яму не далі — у літаральным сэнсе не далі Кнігу скаргаў, заявіўшы, што «Затрыманы аніякіх правоў ня мае».

Судзьдзя Грабоўская засталася беспакаранай

«У ходзе праведзенай праверкі фактаў грубых і непаважлівых адносін да ўдзельнікаў працэсу з боку судзьдзі суду Кастрычніцкага раёну г. Віцебску **Грабоўскай І. В.** ня выяўлена, падстаў для прыцягненьня яе да дысцыплінарнай адказнасьці ня ўгледжваю», — гэтак першы намесьнік начальніка галоўнага ўпраўленьня юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму **Ігар Каржоў** адказаў на заяву, якую накіроўваў у згаданае ведамства кіраўнік віцебскай абласной арганізацыі партыі БНФ Леанід Аўтухоў.

Леанід Аўтухоў прасіў галоўнае ўпраўленьне юстыцыі ўзбудзіць дысцыплінарную вытворчасьць у адносінах да судзьдзі **Іны Грабоўскай**, якая 25 сакавіка вынесла пастанову аб пакараньні яго і ягонага аднапартыйца **Кастуся Смолікава** адміністрацыйным арыштам за раздачу газэты і ўлётак у гандлёвым цэнтры. Названая пастанова, на думку палітыка, выносілася з парушэньнем дзеючага заканадаўства, суд быў старонным і прадузятым, а судзьдзя не абараніла яго грамадзянскія і палітычныя правы ды законныя інтарэсы.

Леанід Аўтухоў адзначыў у сваёй заяве, што судзьдзя падчас працэсу паводзілася груба і непаважліва ў адносінах да прысутных у судзе грамадзян. Партыйны лідэр таксама прывёў шэраг фактаў парушэньня ёю заканадаўства: выносячы рашэньне, судзьдзя Грабоўская не ўлічыла той акалічнасьці, што ён знаходзіўся пад вартаю больш за 48 гадзін, што супярэчыць частцы 2 артыкулу 11.2 працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністрацыйных праваапарушэньнях; апроч таго, яму было дадзена не дастатковa часу на пошук адваката і падрыхтоўку сваёй абароны. Таму, мяркуе сябра партыі БНФ, рашэньне, прынятае ў дачыненьні да яго судом, зьяўляецца несправядлівым і не грунтуецца на законе, а судзьдзю Грабоўскую трэба было б пакараць. Аднак у галоўным упраўленьні юстыцыі аблвыканкаму не прыслухаліся да аргумэнтаў палітыка і адмовіліся задаволіць просьбу, выкладзеную ў ягонай заяве.



Лідзія Ярмошына праігнаравала прапанову віцебскага праваабаронцы



Леанід Сьвецік

Праваабаронца Леанід Сьвецік зьвяртаўся ў Цэнтральную выбарчую камісію з прапановай аб унясеньні зьменаў у выбарчы кодэкс. У прыватнасьці, ён прасіў дадаць у артыкул 11 выбарчага кодэксу азначэньне дзяржаўна-прававога статусу выбарчых камісіяў – у дзеючай цяпер рэдакцыі кодэксу такога азначэньня няма. Надоечы быў атрыманы адказ на прапанову: Лідзія Ярмошына паведаміла праваабаронцу, што ягоны зварот пакінуты без разгляду па сутнасьці.

«Разгляд прапановаў аб зьмене дзейнага заканадаўства, у тым ліку выбарчага, да кампэтэнцыі Цэнтральнай камісіі не належыць, бо камісія зьяўляецца праваапрымяняльным ворганам, а не суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы», — гэтак абгрунтавала старшыня ЦВК адмову разглядаць прапанову праваабаронцы. Цікава, што хаця ЦВК не кампэтэнтная, паводле спадарыні Ярмошынай, разглядаць прапановы аб зьмене заканадаўства, тым ня менш менавіта гэты ворган займаецца распрацоўкай законапраекту аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у выбарчы кодэкс. «Нашы юрысты ўжо распачалі гэтую працу», — заявіла Лідзія Ярмошына карэспандэнту БЕЛТА ў лістападзе 2012 году.

Пра прычыну свайго звароту ў ЦВК распавядае Леанід Сьвецік: «Варта адзначыць, што, напрыклад, у заканадаўстве суседняй Расеі выбарчыя камісіі вызначаюцца як дзяржаўныя ворганы. У нашым жа выбарчым кодэксе дэфініцыя выбарчай камісіі адсутнічае. У Беларусі выбарчая камісія — гэта не арганізацыя і ня ворган, а немаведама што».

«Суды не прызнаюць за камісіямі нейкага юрыдычнага статусу і таму ня могуць прыцягнуць да адказнасьці іх кіраўнікоў, калі тыя парушаюць правы і законныя інтарэсы грамадзян, — працягвае праваабаронца. — Так, падчас выбараў 2012 году быў выпадак у Віцебску, калі старшыня і сакратар акруговай выбарчай камісіі парушылі закон аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. Аднак аднавіць парушаныя правы праз суд не ўдалося, бо, згодна з пастановай суду, выбарчыя камісіі — гэта не арганізацыі, таму дзеяньне згаданага закону на іх не распаўсюджваецца».

«Вельмі шкада, што ЦВК з фармальных прычын не пажадала адказаць на маю прапанову аб унясеньні зьмены і наданьні выбарчым камісіям нейкага арганізацыйнага статусу. Але мяркую, што юрысты, якія працуюць над папраўкамі ў выбарчы кодэкс, зразумелі сутнасьць прававой калізіі, на якую я зьвярнуў увагу. Спадзяюся, што яны ўсё-такі ўнясуць адпаведныя зьмены ў кодэкс, каб калізія была выпраўленая», – сказаў Леанід Сьвецік.

Канстытуцыйны суд ухіліўся ад абароны правоў, гарантаваных Канстытуцыяй

Канстытуцыйны суд ня стаў разглядаць пытаньне, пастаўленае перад ім віцебскім сябрам КХП-БНФ **Янам Дзяржаўцавым**. Апошні прасіў суд разабрацца з рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму № 881 «Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску». На думку палітыка, згаданае рашэньне мясцовых уладаў супярэчыць нормам Канстытуцыі, бо, фактычна, пазбаўляе грамадзян права на мірныя сходы.

Асноўная праблема рашэньня № 881 – патрабаваньне да арганізатараў масавых мерапрыемстваў загадзя заключаць дамовы з ЖКГ, міліцыяй і лекарамі на абслугоўваньне мерапрыемстваў. Яшчэ ні разу не было, каб усе неабходныя дамовы атрымалася заключыць: арганізацыі, пералічаныя ў рашэньні гарвыканкаму, знаходзяць разнастайныя прычыны, каб пазьбегнуць заключэньня дамоваў. А бяз гэтых дамоваў атрымаць дазволу на пікет, мітынг або шэсьце немагчыма.

Што да заключэньня дамоваў, часам даходзіць да кур'ёзу. Так, каб выканаць рашэньне № 881, Ян Дзяржаўцаў 7 сакавіка зьвярнуўся ва Ўпраўленьне ўнутраных спраў Віцаблвыканкаму. Ён прасіў заключыць зь ім дамову на абслугоўваньне запланаванага на 25 сакавіка (Дзень Волі) пікетаваньня. Адказ на просьбу партыйнага актывіста часовы выконваючы абавязкі па пасадзе начальніка міліцыі грамадзкай бясьпекі УУС Ігар Скарыновіч напісаў менавіта... 25 сакавіка — у дзень меркаванай акцыі. Па пошце адказ быў атрыманы праз 2 дні.

У сваім адказе ад 25 сакавіка міліцэйскі начальнік Скарыновіч напісаў Яну Дзяржаўцаву: «Паведамляю, для заключэньня дамовы на забесьпячэньне аховы грамадзкага парадку пры правядзеньні 25 сакавіка 2013 году пікетаваньня, што арганізуецца Вамі, Вы можаце ў любы зручны для Вас час зьвярнуцца ва ўпраўленьне фінансаў і тылу УУС». Такі адказ, атрыманы ўжо пасьля 25 сакавіка, Ян Дзяржаўцаў успрыняў як зьдзек і непрыхаваны цынізм.



Ян Дзяржаўцаў

Каб пацьвердзіць, што рашэньне № 881 выканаць немагчыма, і што ў выніку немагчыма скарыстацца з правоў, гарантаваных Канстытуцыяй, Ян Дзяржаўцаў далучыў да свайго звароту ў Канстытуцыйны суд ажно 26 адмоваў віцебскіх органаў улады на правядзеньне масавых мерапрыемстваў, атрыманых ім і сябрамі яго партыі цягам 2012 і пачатку 2013 гадоў.

Аднак Канстытуцыйны суд заплюшчыў вочы на відавочнае парушэньне Канстытуцыі: «Канстытуцыйны суд разглядае пытаньні аб канстытуцыйнасьці нарматыўных прававых актаў па прапановах прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў, Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Вышэйшага гаспадарчага суду, Савету міністраў Рэспублікі Беларусь... Такім чынам, нарматыўныя прававыя акты могуць быць разгледжаныя Канстытуцыйным судом на прадмет іх адпаведнасьці Канстытуцыі толькі пры ўмове ўнясеньня адпаведнай прапановы адным з вышэйназваных дзяржаўных органаў і службовых асоб», — паведамляецца ў лісьце за подпісам першага намесьніка начальніка сакратарыяту Канстытуцыйнага суду В.І. Селядзеўскага.

Такім чынам, грамадзянскія і палітычныя правы ў Віцебску і далей будуць парушацца. Ян Дзяржаўцаў у разгубленасьці. Ён ня ведае, якім чынам яго партыя як зарэгістраваная палітычная арганізацыя можа легальна выконваць свае функцыі.

«Сучасная незаконная ўлада Беларусі, выхаваная ў "найлепшых традыцыях сталінскай эпохі", робіць усё, каб канчаткова зьнішчыць нашу краіну, распрадаць за капейкі багацьце краіны, якое ёй не належыць, яе нетры, выкапні, фабрыкі, заводы, каб набіць свае і гаспадарскія расейскія кішэні і каб як мага хутчэй здаць Беларусь расейцам, а беларусаў зрабіць іхнымі рабамі», – так Ян Дзяржаўцаў выказаўся наконт сытуацыі, што склалася.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.